УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
“БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ”

УДК 008(=161.3):[13а12+316.4+12] “18”(043.3)

**ЖЫЛКО**
**Ульяна Аляксандраўна**

# ПОЛІПАРАДЫГМАЛЬНАСЦЬ ЯК АДМЕТНАСЦЬ САЦЫЯДЫНАМІКІ БЕЛАРУСКАЙ ДУХОЎНАЙ КУЛЬТУРЫ XIX СТ.

**Аўтарэферат**
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата культуралогіі

па спецыяльнасці 24.00.01 – тэорыя і гісторыя культуры

Мінск 2015

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Работа выканана на кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Навуковы кіраўнік: **Смолік Аляксандр Іванавіч,** доктар культуралогіі, прафесар, загадчык кафедры культуралогіі УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Афіцыйныя апаненты: **Павільч Аляксандр Аляксандравіч,** доктар культуралогіі, дацэнт, прафесар кафедры гісторыі сусветнай культуры і турызму УА “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт”

**Банцэвіч Павел Казіміравіч**, кандыдат культуралогіі, дацэнт, дацэнт кафедры грамадскіх навук УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт”

Апаніруючая арганізацыя: **ДУА “Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”**

Абарона адбудзецца 28 студзеня 2016 г. а 16.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 09.03.01 пры УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацваў” па адрасе: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, чытальная зала бібліятэкі; e-mail: buk@buk.by; тэлефон вучонага сакратара: 222-83-36.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацваў”.

Аўтарэферат разасланы 23 снежня 2015 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
канидат мастацтвазнаўства,
дацэнт В. У. Мазанік

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# КАРОТКІЯ ЎВОДЗІНЫ

У апошнія гады ў айчынным культуралагічным дыскурсе актуалізавалася пастаноўка пытанняў, звязаных з тэарэтыка-метадалагічным асэнсаваннем беларускай духоўнай культуры ў перыяд фарміравання нацыі. Мастацкая спадчына XIX ст., спалучаючы ў сабе філасафічнасць і вобразнасць, выступае дзейсным сродкам артыкуляцыі нацыянальна-культурнай адметнасці. Зварот да рэтраспекцыі праз мастацкія творы дазваляе зразумець сутнасць многіх сучасных падзей у гісторыка-культурным працэсе, пераасэнсаваць мінулы досвед і сканцэнтравацца на акцэнтах, якія павінны стаць вызначальнымі для паспяховага сацыякультурнага развіцця нацыі і культуры. Актуальнасць тэмы дысертацыі абумоўлена ўзрастаннем цікавасці да акрэсленых пытанняў, якія набываюць асаблівую значнасць у сувязі з распаўсюджваннем палітыкі мультыкультуралізму і актывізацыяй глабалізацыйных працэсаў у постмадэрнавую эпоху, якая ў пэўнай ступені характарызуецца пасіўнай энтрапіяй духоўных патэнцый, уніфікацыяй культурнай спецыфікі. У сувязі з гэтым у сучасным грамадстве наспявае неабходнасць самаідэнтыфікацыі беларускага народа ў сусветнай прасторы, захавання непаўторнасці і самабытнай адметнасці нацыянальнай культуры ў дынамічным свеце праз выразна акрэсленую сістэму сэнсавых каардынат.

Паняцце “сацыякультурная парадыгма” дазваляе даследаваць духоўную культуру ў яе цэласнасці і зменлівасці. Творы мастацтва XIX ст. выступаюць у якасці тэкстаў, якія адлюстроўваюць асаблівасці сацыядынамікі духоўнай культуры абранай гістарычнай эпохі. Паколькі любы тэкст ствараецца на аснове кантэксту і прадугледжвае далейшае вяртанне да яго, то мастацкую культуру XIX ст. варта разглядаць менавіта ў межах пэўнай сацыякультурнай парадыгмы, дзе яна вызначаецца як сродак трансляцыі культуразначнай інфармацыі, якая рэалізуецца ў працэсе азначвання, замацавання інфармацыі ў пэўным аб’екце духоўнай культуры (каштоўнасцях, ідэалах, сімвалах). Тым больш, што гэты аспект творчай спадчыны суб’ектаў культуры XIX ст. застаўся па-за ўвагай беларускіх культуролагаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі**

Дысертацыя з’яўляецца часткай навукова-даследчай праблематыкі кафедры культуралогіі УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” па тэме “Полімарфізм беларускай культуры як фактар дынамічнага развіцця сучаснага грамадства” (зацверджана Саветам УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, пратакол № 4 ад 21 снежня 2010 г.), (зарэгістравана ў Дзяржаўным рэестры НІОК(Т)Р 30.12.2011 г. № дзярж. рэгістрацыі 20115725).

Ажыццяўленне дысертацыйнага даследавання адпавядае прыярытэтным накірункам навуковых даследаванняў, адлюстраваных у дзяржаўнай праграме “Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава” на 2011-2015 гг. (зацверджана пастановай Савета Міністраў

Рэспублікі Беларусь № 886 ад 09.06.2010 г.), а таксама дзяржаўнай праграме “Культура Беларусі” на 2011-2015 гг. (зацверджана пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 1905 ад 26.12.2010 г.).

**Мэта і задачы даследавання**

*Мэтай* даследавання з’яўляецца выяўленне спецыфікі поліпарадыгмальнасці як адметнасці сацыядынамікі беларускай духоўнай культуры XIX ст. (на матэрыяле твораў літаратуры і жывапісу).

Дасягненне пастаўленай мэты патрабуе вырашэння наступных *задач*:

- акрэсліць нацыянальную адметнасць сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства XIX ст. праз асветніцкую, рамантычную і рэалістычна-дэмакратычную парадыгмы;
- выявіць аксіялагічны кантэкст беларускай духоўнай культуры XIX ст. і спецыфіку інтэрпрэтацыі базавых каштоўнасцей суб’ектамі сацыякультурных парадыгмаў;
- вылучыць дамінуючыя грамадскія ідэалы і асаблівасці іх увасаблення ў беларускай мастацкай культуры XIX ст.;
- раскрыць сімвалічны змест духоўнай культуры XIX ст. на аснове літаратурных твораў і твораў жывапісу.

**Навуковая навізна**

Дысертацыя з’яўляецца першым у беларускай культуралогіі даследаваннем, у якім прадстаўлены комплексны аналіз духоўнай культуры XIX ст. у адпаведнасці з выяўленнем і апісаннем парадыгмаў сацыякультурнага развіцця грамадства, што дазваляе пашырыць і ўдасканаліць методыку даследавання сацыядынамікі духоўнай культуры канкрэтнага гісторыка-культурнага перыяду. У дысертацыі ўпершыню ў беларускай культуралогіі:

- акрэслена нацыянальная адметнасць сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства праз асветніцкую, рамантычную, рэалістычна-дэмакратычную парадыгмы;
- у структурных межах поліпарадыгмальнасці раскрыты аксіялагічны і сімвалічны змест беларускай духоўнай культуры XIX ст.;
- вылучаны дамінуючыя грамадскія ідэалы і асаблівасці іх пераасэнсавання суб’ектамі мастацкай творчасці XIX ст.;
- акрэслены “праграма жыццяўстойлівасці” і “праграма актыўнага дзеяння”, актуальныя для беларускага грамадства ў эпоху фарміравання нацыянальнай культуры.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Адметнасцю сацыядынамікі беларускай духоўнай культуры XIX ст. выступае поліпарадыгмальнасць як комплексная характарыстыка сацыякультурнай цэласнасці разглядаемай эпохі, абумоўленая сэнсавым адзінствам элементаў культуры (каштоўнасцей, ідэалаў, архетыпічных вобразаў і сімвалаў) у іх стылёвай сінхроннасці на дадзеным этапе развіцця. Поліпарадыгмальнасць беларускай духоўнай культуры XIX ст. выяўляецца на аснове полістылёвасці – адначасовым суіснаванні дамінуючых стыляў эпохі як спосабаў актуалізацыі сутнаснай асаблівасці асветніцкай, рамантычнай і рэалістычна-дэмакратычнай сацыякультурных парадыгмаў XIX ст. Поліпарадыгмальнасць абумоўлена канструктыўным

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

узаемадзеяннем, сінтэзам ідэйных асноваў розных парадыгмальных накірункаў і гарманічным спалучэннем супрацьлеглых ідэй: а) адсутнасць рэзкага размежавання паміж аналітычна-рацыянальным і мастацка-эмацыянальным пластамі культуры; б) сувязь духоўнага і матэрыяльнага; в) паяднанасць розуму і інтуіцыі ў спасціжэнні свету; г) наяўнасць заглыбленага індывідуалізму ва ўраўнаважанасці з кроўна-сваяцкай роднаснасцю грамады; д) гарманічнае спалучэнне пратэстнага бунту і суцішанай сузіральнасці ва ўспрыняцці рэчаіснасці; е) сінтэз народна-хрысціянскага і рыцарска-гераічнага пачаткаў у культуры. На аснове сінтэзу сацыякультурных парадыгмаў XIX ст. пачынае фарміравацца беларуская нацыянальная культура.

2. Аксіялагічны комплекс, вылучаны ў творах індывідуальных суб’ектаў культуры XIX ст., уяўляе сабой “праграму жыццяўстойлівасці”, паколькі існуе ў латэнтным модусе – у рэжыме забеспячэння трывалай асновы будучай нацыі. Дадзеная праграма ўключае ў сябе дзве групы каштоўнасцей: а) аксіялагемы, якія забяспечваюць існаванне чалавека ў грамадстве; б) рэфлексіўныя аксіялагемы, якія спрыяюць самазахаванню асобы, унутранай гармоніі чалавека. Адметнасць інтэрпрэтацыі сістэмы каштоўнасцей заключаецца ў тым, што большасць аксіялагем адносіцца да народнай (традыцыйнай) і рэлігійнай (хрысціянскай) сістэмы светапоглядавых каардынат: боскія запаведзі і маральныя пастулаты арганічна спалучаюцца з аксіялагемамі культуры каляндарна-земляробчага тыпу.

3. Ідэалы з’яўляюцца значнымі структурнымі элементамі поліпарадыгмальнасці духоўнай культуры XIX ст. У якасці носьбітаў найвышэйшай каштоўнасці, выяўленых на матэрыяле твораў літаратуры і жывапісу, выступаюць ідэал мінулага, ідэал вяртання страчанай Радзімы, ідэал свабоды, ідэал сацыяльнай і этнічнай кансалідацыі грамадства, ідэал сацыяльнай роўнасці, ідэал праўды. Сукупнасць вышэйакрэсленых ідэалаў абумоўлівае “праграму актыўнага дзеяння”, якая ўключае арсенал дзейсных сродкаў па пераўтварэнні рэчаіснасці на аснове імкнення да рэалізацыі ідэала і супрацьстаяння дэструктыўным уплывам. У пералік дадзеных сродкаў уваходзяць: а) *негвалтоўны (пасіўны) супраціў* шляхам асветы, творча-стваральнай дзейнасці, добрасумленнай працы, пакорлівай цярплівасці; б) *актыўная барацьба*, адкрытае змаганне, мужная абарона свайго краю, якая базуецца на каштоўнасных арыентацыях мінулай шляхецка-рыцарскай эпохі (гонары, годнасці, адданасці Айчыне, ахвярнай любові, змаганні за праўду і свабоду).

Адметнасць увасаблення каштоўнасцей і ідэалаў у мастацкай творчасці XIX ст. пацвярджае, што станаўленне беларускай нацыянальнай культуры адбывалася на аснове сінтэзу – арганічнага паяднання каштоўнасцей, якія носяць народна-хрысціянскі характар, і ідэалаў, што абапіраюцца на шляхецкую, у аснове сваёй рыцарска-гераічную, мінулую традыцыю.

4. У межах сімвалічнага зместу поліпарадыгмальнасці духоўнай культуры беларусаў XIX ст. вылучаецца архетып героя, які прадстаўлены ў разнастайных вобразах-мадыфікацыях: асветніка, змагара, музыкі, абаронцы, творцы, абуджальніка, рэфарматара, гаспадара, архетыпы анімы, самасці, персоны, мудрага старца, ценю, Маці-Зямлі, Музыкі/Песні, а таксама сімвалы агню, крыжа, могілак, астрога, пусткі, пажарышча, зерня,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дома. Аксіялагічны аналіз інтэрпрэтацыі сімвалічных структур у творчасці XIX ст. паказвае абумоўленасць іх сэнсавага прачытання актуальнай палітычнай і сацыякультурнай сітуацыяй.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені**

Дысертацыйнае даследаванне з'яўляецца вынікам асэнсавання беларускай духоўнай культуры XIX ст. у яе цэласнасці і зменлівасці, тэарэтычным абагульненнем шматгадовага вывучэння аўтарам творчай спадчыны суб'ектаў айчыннай культуры XIX ст. Праведзены тэарэтыка-метадалагічны аналіз паняцця "сацыякультурная парадыгма", вызначана спецыфіка сацыядынамікі беларускай духоўнай культуры XIX ст. на аснове выяўлення прыкмет асветніцкай, рамантычнай і рэалістычна-дэмакратычнай сацыякультурных парадыгмаў, акрэслены характэрныя рысы поліпарадыгмальнасці тагачаснай духоўнай культуры, выяўлены каштоўнасны кантэкст XIX ст., вылучаны набор дамінуючых грамадскіх ідэалаў даследуемай эпохі, на іх аснове акрэслены "праграма жыццяўстойлівасці" і "праграма актыўнага дзеяння", абгрунтавана іх вызначальная роля ў развіцці беларускай духоўнай культуры на працягу яе гістарычнага развіцця, раскрыты сімвалічны змест духоўнай культуры на аснове выяўленых у творах літаратуры і жывапісу архетыпічных вобразаў і сімвалаў.

**Апрабацыя дысертацыі**

Вынікі даследавання апрабаваны на 20 канферэнцыях міжнароднага і рэспубліканскага ўзроўню: Міжнародная навуковая канферэнцыя "Этнасацыяльныя і канфесіянальныя працэсы ў сучасным грамадстве" (Гродна, 2–3 сн. 2011 г.), VIII Міжнародная навуковая канферэнцыя "Садружнасць навук. Баранавічы – 2012" (Баранавічы, 23–24 мая 2012 г.), II Міжнародная навуковая канферэнцыя "Актуальныя праблемы мастацтва: гісторыя, тэорыя, методыка" (Мінск, 7–8 красав. 2011 г.), II Міжнародная навуковая завочная канферэнцыя "Культура: адкрыты фармат – 2012" (Мінск, 20 чэрв. 2012 г.), Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя "Камунікатыўныя стратэгіі мастацтва" (Брэст, 13–14 красав. 2012 г.), Міжнародная навуковая канферэнцыя "Мова. Грамадства. Праблема міжкультурных камунікацый" (Гродна 20–21 сак. 2012 г.), XXXVII навуковая канферэнцыя студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў "Сучасны культурны працэс: праблемы, перспектывы, метады даследавання" (Мінск, 18–19 красав. 2012 г.), Міжнародная навуковая канферэнцыя "Універсальнае і нацыянальнае ў культуры" (Мінск, 20–21 красав. 2012 г.), Міжнародная навукова-тэарэтычная канферэнцыя "Еўропа: актуальныя праблемы этнакультуры" (Мінск, 22 мая 2012 г.), XXXIX выніковая навуковая канферэнцыя студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў "Навука вачыма маладых" (Мінск, 26 сакав. 2014 г.), XXXVIII выніковая навуковая канферэнцыя студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў (Мінск, 19 крас 2013 г.), II Кандрацьеўскія чытанні "Талент, непадуладны часу" (Вілейка, 25 мая 2013 г.), VIII Міжнародная навуковая канферэнцыя "Менталітэт славян і інтэграцыйныя працэсы: гісторыя, сучаснасць, перспектывы" (Гомель, 23–24 мая 2013 г.), Міжнародная навуковая канферэнцыя "Хрысціянства і грамадства" (Баранавічы 17 мая 2013 г.), XIX Міжнародныя Кірыла-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мяфодзіеўскія чытанні (Мінск, 22–24 мая 2013 г.), III Міжнародная навуковая канферэнцыя “Культура: адкрыты фармат–2013” (Мінск, 17 чэрв. 2013 г.), Міжнародная канфэрэнцыя “Кансалідацыя навуковых даследаванняў” (Данецк, 14 верас. 2013 г.), Міжнародная канферэнцыя “Філасофскія каштоўнасці сучаснай культуры” (Мінск, 10–11 кастр. 2013 г.), Міжнародная канферэнцыя «Наука та сучасність: виклики ХХІ століття», (Кіеў, 31 сн. 2014 г.), XXXIX навуковая канферэнцыя студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў “Інтэрпрэтацыя сімвала ў нацыянальнай культуры, (Мінск, 26 сак. 2014 г.); Пятыя Міжнародныя Тышкевіцкія чытанні (Мінск, Крэцінга, 14–15 мая 2014 г.), Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «1-я Вясеннія навуковыя чытанні» (Кіеў, 30 мая 2015 г.).

**Апублікаванасць вынікаў даследавання**

Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 26 навуковых публікацыях: 5 артыкулах у навуковых часопісах, уключаных у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў аб’ёмам 3,5 аўтарскія аркушы, 5 артыкулах у навуковых зборніках аб’ёмам 1,8 аўтарскія аркушы, 16 артыкулах у матэрыялах і тэзісах навуковых канферэнцый аб’ёмам 3,9 аўтарскія аркушы. Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў складае 9,2 аўтарскіх аркушы.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, двух раздзелаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу. Поўны аб’ём дысертацыі 172 старонкі, з іх 148 старонак займае асноўны тэкст, 24 старонкі – бібліяграфічны спіс, які складаецца са спісу выкарыстаных крыніц (292 найменні на беларускай і рускай мовах) і спісу публікацый аўтара (26 найменняў).

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

**У першым раздзеле *“Тэарэтыка-метадалагічныя асновы даследавання”*** падаецца аналітычны агляд навуковай літаратуры па даследуемай праблеме; абгрунтоўваецца метадалогія дысертацыйнага даследавання; разглядаецца гісторыка-культурны перыяд XIX ст. з пункту гледжання выяўлення сацыякультурных парадыгмаў, адметнасці іх канструктыўнага ўзаемадзеяння ў межах беларускай духоўнай культуры XIX ст.

**У *падраздзеле 1.1 “Аналітычны агляд літаратуры па праблеме”*** праводзіцца аналіз ступені даследаванасці гісторыка-культурнага перыяду XIX ст. у айчыннай гуманітарыстыцы, падаецца агляд прац па розных аспектах тагачаснай духоўнай культуры (гістарычным, сацыяльным, філасофскім, мастацкім).

Першыя спробы распрацоўкі блізкіх да вызначанай праблемы пытанняў звязаны з іх аналізам даследчыкамі XIX ст. І. Грыгаровічам, З. Даленгам-Хадакоўскім, А. Кіркорам, Т. Нарбутам, П. Шпілеўскім, М. Без-Карніловічам, М. Федароўскім.

У XX ст. з’явілася шмат разнажанравых навуковых прац, прысвечаных тым ці іншым сацыякультурным адметнасцям мінулага стагоддзя, якое ў той час пачынае разглядацца як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурна-гістарычны феномен. Даследаванню гістарычнага кантэксту сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства XIX ст. прысвечаны працы М. Біча, І. Вугліка, А. Каханоўскага, С. Кузняевай, С. Куль-Сельверставай, А. Смаленчука, С. Шыдлоўскага, І. Чаквіна, дзе навукоўцы закранаюць праблемы тагачаснай сацыякультурнай сітуацыі, культуры асобных сацыяльных груп і гістарычныя абставіны эпохі.

Сярод айчынных філосафаў варта вылучыць працы І. Бабкова, Э. Дарашэвіча, У. Конана, А. Майхровіча, С. Падокшына, прысвечаныя разгляду айчыннай грамадскай і філасофскай думкі, у тым ліку ў межах дадзенага перыяда, у каторых прасочваецца глыбокі аналіз тэарэтычнага мыслення, формаў спасціжэння рэчаіснасці, адметнасцей мастацкай рэфлексіі ў межах феноменаў Асветніцтва, рамантызму, рэалізму.

У айчыннай гуманітарыстыцы шмат хто з даследчыкаў звяртаўся да разгляду ідэйна-мастацкіх накірункаў духоўнай культуры XIX ст. і адметнасці іх увасаблення ў літаратурнай спадчыне: С. Александровічам, І. Багдановіч, А. Брусевічам, І. Бурдзялёвай, С. Драздом, В. Еўмяньковым, Г. Кісялёвым, К. Лецкам, А. Лойкам, А. Мальдзісам, У. Мархелем, С. Мінскевічам, А. Пяткевічам, С. Сабуцем, А. Яскевічам. Сацыякультурны і культурфіласофскі феномен Асветніцтва, на аснове якога выкрышталізавалася аднайменная сацыякультурная парадыгма, і яго нацыянальныя адметнасці ў агульнаеўрапейскім кантэксце прааналізаваны ў працах Г. Адамовіч, Э. Дарашэвіча, Э. Дубянецкага, У. Міськевіча, А. Парфянцовай, В. Салеева.

Што датычыцца навуковых прац, прысвечаных даследаванню мастацкай культуры XIX ст. на прыкладзе адлюстравання яе сэнсавай асновы праз выяўленчае мастацтва, то варта адзначыць, што зварот айчыннай гуманітарыстыкі да яе адбыўся толькі ў другой палове XX ст. На сённяшні дзень даследаванню жывапісу розных мастацкіх накірункаў і спадчыны асобных мастакоў XIX ст. прысвечаны працы В. Буйвала, Л. Дробава, Э. Калкоўскай, Б. Крэпака, Б. Лазукі, В. Паграноўскага, В. Пракапцовай, А. Парфянцовай, Л. Сафронавай, І. Свірыды, І. Сычовай, В. Чаропкі, А. Чупрынскага.

У пачатку XXI ст. да вывучэння сацыякультурнай сітуацыі і мастацкай творчасці XIX ст. пачынаюць звяртацца і беларускія культуролагі. Так, У. Конан, А. Рагуля, А. Смолік, Т. Сухоцкая, І. Шумская з культуралагічных пазіцый закранаюць асобныя праблемы сацыякультурнай сітуацыі, праблему стылю, пытанні аксіялагічнага зместу мастацкай творчасці, а таксама асобныя аспекты культурфіласофскай дзейнасці індывідуальных суб’ектаў беларускай культуры (пісьменнікаў, філосафаў, мастакоў, музыкаў). Метадалагічную значнасць для нашага даследавання ўяўляюць навуковыя напрацоўкі П. Банцэвіча, В. Вярбіцкай, прысвечаныя разгляду класічнай мастацкай спадчыны ў культуралагічным аспекце.

У той жа час у замежнай гуманітарыстыцы падрыхтавана значная колькасць навуковых напрацовак тэарэтыка-метадалагічнага характару. Для ўдакладнення зместу паняцця "сацыякультурная парадыгма" ў значэнні феномена сацыякультурнай цэласнасці ў працы важную ролю адыгралі розныя інтэрпрэтацыі адзінства гісторыка-культурнага працэсу, прадстаўленыя ў работах М. Вебера, Л. Вітгенштэйна, В. Дзільтэя, Г. Зэдльмаера,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

О. Шпенглера. Разгляд дынамічнага аспекту зместу паняцця "сацыякультурная парадыгма" абапіраўся на навуковыя высновы даследчыкаў дынамікі і рытмаў сацыякультурнага развіцця М. Кагана, А. Моля, П. Сарокіна. Метадалагічная аснова даследавання склалася ў працэсе аналізу навуковых прац Н. Бакач, Т. Куна, Н. Петрачэнкі.

Праблема выяўлення каштоўнаснага ўзроўня ў структуры сацыякультурнай парадыгмы разглядалася намі з пазіцыі аксіялагічнага падыходу да культуры, распрацаванага В. Віндэльбантам, М. Гартманам, Р. Лотцэ, Г. Рыкертам, Л. Сталовічам, М. Шэлерам. У працэсе разгляду каштоўнаснага кантэксту духоўнай культуры ХІХ ст. мы абапіраліся на працы, прысвечаныя аксіялагічнай праблематыцы, разгляду каштоўнасцей у святле этнакультуралагічнага падыходу: М. Каган, В. Салееў, Ю. Чарняўская. Разгляду ідэалаў як формы існавання каштоўнасцей у культуры прысвечаны працы М. Крукоўскага, Я. Лагуноўскай, Л. Уладыкоўскай, Т. Харламавай.

Пры звароце да выяўлення адметнасці інтэрпрэтацыі архетыпаў і сімвалаў, у якіх яны ўвасабляюцца, як формы трансляцыі не толькі сэнсаў, але і каштоўнасцей культуры, у дысертацыйным даследаванні былі выкарыстаны асобныя ідэі навукоўцаў Э. Гусэрля, Л. Кажухоўскай, Э. Касірэра, У. Конана, Ю. Лотмана, А. Свечнікавай, І. Фадзеевай, К. Юнга.

Такім чынам, аналітычны агляд зместу разнажанравых прац, у якіх праводзіцца вузкаспецыфічны гістарычны, філасофскі, літаратуразнаўчы, мастацтвазнаўчы аналіз духоўнай культуры ХІХ ст., паказаў, што большасць навуковых даследаванняў датычыцца або асобных галін культуры, або даюць толькі абагульненае ўяўленне аб адзінкавых культурных фактах у межах дадзенай эпохі. Прыходзіцца канстатаваць, што некаторыя пытанні культуралагічнага характару на сённяшні дзень застаюцца нявырашанымі, а беларуская духоўная культура ХІХ ст. патрабуе комплекснага аналізу з пункту гледжання культуралагічнай навукі. Тым больш, што метадалагічная база, напрацаваная ў сучаснай тэорыі культуры, дазваляе паспяхова гэта зрабіць.

**У *падраздзеле 1.2 "Метадалогія і метады даследавання"*** выкладаецца агульная канцэпцыя працы, вызначаюцца асноўныя метады даследавання азначанай праблемы. Навуковая работа ажыццяўлялася на падставе *комплекснага падыходу*, які дазволіў разгледзець мастацкую культуру эпохі як складаны шматгранны феномен, які транслірує асноўныя сацыякультурныя змены. Асаблівая ўвага надаецца *сацыякультурнай парадыгме* як асноўнаму метадалагічнаму сродку даследавання духоўнай культуры эпохі ў яе цэласнасці і зменлівасці. *Сістэмны падыход* да даследавання духоўнай культуры ХІХ ст. дазволіў ахарактарызаваць яе як шматузроўневую сістэму. У якасці аднаго з базавых у дысертацыі прымяняўся *аксіялагічны падыход*, выкарыстаны падчас выяўлення адметнасцей пераасэнсавання такіх аб'ектаў беларускай духоўнай культуры, як ідэалы, каштоўнасці і каштоўнасныя арыентацыі. На этапе выяўлення сімвалічнага зместу твораў, абумоўленага сацыякультурнай сітуацыяй, быў выкарыстаны *семіятычны падыход* да культуры, паколькі любы культурны феномен выступае ў якасці тэксту як цэласнай функцыянальнай структуры, адкрытай для мноства сэнсаў. У якасці тэкстаў культуры былі разгледжаны літаратурныя творы і творы жывапісу, у якіх былі выяўлены сімвалічны змест вобразнай знакавай сістэмы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

твора, а таксама яго сувязь з калектыўным бессвядомым і сацыякультурным кантэкстам XIX ст. *Герменеўтычны метад* спрыяў разгляду тэкстаў культуры ў сінхронным і дыяхронным сацыякультурных кантэкстах, дазваляў выявіць адметнасць іх сэнсаадлюстравання, спосабаў захавання і перадачы культурнага кода разглядаемай эпохі. *Гістарычны* метад дазволіў вызначыць гісторыка-культурны кантэкст эпохі, выявіць моманты пераемнасці ў грамадскім, палітычным, ідэйным развіцці з папярэднім перыядам сацыякультурнага развіцця, акрэсліць актуальнасць даследавання эпохі для вывучэння сучаснай нацыянальнай культуры. Значнасць для даследавання набыў *структурна-функцыянальны падыход* да разгляду катэгорыі "сацыякультурная парадыгма", якая складаецца з суб'ектнага, аксіялагічнага, сімвалічнага і светапоглядавага элементаў, узаемазвязаных і ўзаемаабумоўленых. Агульнанавуковы ўзровень даследавання прадстаўлены выкарыстаннем *метадаў аналізу, апісання, сістэматызацыі, аналогіі і абагульнення.*

***У падраздзеле 1.3 "Парадыгмы сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства XIX ст."*** праведзены аналіз духоўнай культуры XIX ст. у адпаведнасці з выяўленнем і апісаннем парадыгмаў сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства, адзначаны нацыянальныя адметнасці сацыякультурных парадыгмаў, раскрыта поліпарадыгмальнасць эпохі як дамінуючая рыса сацыядынамікі беларускай духоўнай культуры XIX ст.

Пад *сацыякультурнай парадыгмай* варта разумець феномен культурнай цэласнасці канкрэтна-гістарычнай эпохі, у аснове каторага ляжыць сэнсавае адзінства рухомых элементаў культуры, прадстаўленых у іх стылёвай сінхроннасці. Сацыякультурная парадыгма выступае ў якасці адмысловай структуры, якая складаецца з упарадкаваных і узаемазвязных паміж сабой структурных элементаў: узроўня каштоўнасцей, узроўня светапоглядных элементаў (інтэлектуальны ўзровень, эмацыйны стан, стыль мыслення), узроўня ідэалаў (матыватараў да дзеяння), узроўня архетыпічных вобразаў і сімвалаў часу. Сацякультурная парадыгма адлюстроўвае рэалізацыю дадзеных структурных элемантаў у рэчах, словах, ідэях, паводзінах, тэкстах – у культурных фактах.

Стыль з'яўляецца тым паняццем, з дапамогай якога можна апісаць сацыякультурную парадыгму як феномен культурнай цэласнасці. Мэтазгодна разглядаць стыль як сістэму заканамернасцей, правіл і прынцыпаў, уласцівых гісторыка-культурнай эпосе, адмысловы спосаб жыццядзейнасці сумарнага і індывідуальнага суб'ектаў культуры ў яе межах, у тым ліку на алюстраваны на ўзроўні мастацкай рэфлексіі.

Імкненне прааналізаваць сацыядынаміку беларускай духоўнай культуры XIX ст. на аснове тэкстаў мастацкай культуры абумоўлена тым фактам, што у той час мастацтва праз вобразы і алюзіі трансліравала філасофскія і сэнсавыя рэфлексіі нацыянальнага мыслення, паколькі асэнсаванне беларускай рэчаіснасці ў тэарэтычнай форме грамадскай і філасофскай думкі было пад адміністрацыйным пераследам. У беларускай культуры XIX ст. стыль эпохі можа вызначацца дамінуючым стылем у мастацтве: сінтэзаваныя ідэйна-мастацкія накірункі выходзяць за межы мастацкай сферы, становяцца стылем жыцця для многіх суб'ектаў-стваральнікаў культуры. Светапоглядавыя адметнасці сацыякультурнай парадыгмы ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтве адлюстроўваюцца праз спосаб мастацкага мыслення – праз яго сацыякультурная парадыгма ўзнаўляецца ў мастацкай рэфлексіі.

У гісторыі айчыннай культуры XIX ст. ідзе працэс сінхранізацыі і актыўнай адаптацыі актуальных сэнсаў заходнееўрапейскіх ідэйна-мастацкіх накірункаў і плыней (асветніцтва, рамантызму і рэалізму), якія ўваходзяць у мясцовы гістарычны кантэкст, дапаўняюць новымі сэнсамі агульны стыль культуры, адаптуюцца і насычаюцца нацыянальна-спецыфічнымі рысамі.

*Поліпарадыгмальнасць* беларускай духоўнай культуры XIX ст. ёсць комплексная характарыстыка развіцця культуры акрэсленага перыяда, заснаваная на сінтэзаваным узаемадзеянні сацыякультурных парадыгмаў XIX ст. у адным культурным полі: асветніцкай, рамантычнай, рэалістычна-дэмакратычнай. Да асноўных рысаў *поліпарадыгмальнасц*і можна аднесці наступныя:

- сінтэз сацыякультуных парадыгмаў, які праяўляецца ў адсутнасці выразнай акрэсленасці розных з’яваў не толькі эстэтычнага, але і мастацкага, ідэйнага характару ў межах эпохі XIX ст.;
- адсутнасць непрымірымага антаганізму ў вызначальных ідэях асветніцкай, рамантычнай і рэалістычна-дэмакратычнай парадыгмаў, сінтэз гэтых ідэй – сінтэз розуму і інтуіцыі, матэрыяльнага і духоўнага, аналітычнага і эмацыйнага і інш.;
- арыентацыя творчай рэфлексіі суб'ектаў культуры на сінтэзаваны аксіялагічны змест парадыгмальных накірункаў;
- увасабленне ідэй розных парадыгмаў на дзейнасным і творчым узроўнях актыўнасці суб’ектаў культуры;
- паступовасць, павольнасць тэмпу развіцця духоўнай культуры, эвалюцыйная пераемнасць з культурай папярэдняй эпохі.

**У другім раздзеле “Адметнасць аксіялагічнага і сімвалічнага комплексаў духоўнай культуры XIX ст. (на матэрыяле твораў літаратуры і жывапісу)”** выяўлена адметнасць інтэрпрэтацыі каштоўнасцей, грамадскіх ідэалаў і сімвалаў у творчай спадчыне суб’ектаў духоўнай культуры XIX ст.; раскрыты “праграма жыццяўстойлівасці” і “праграма актыўнага дзеяння”.

***У падраздзеле 2.1 “Аксіялагічныя дамінанты і іх пераасэнсаванне суб’ектамі мастацкай культуры XIX ст.”*** на матэрыяле мастацкай спадчыны XIX ст. выяўлены адметнасці аксіялагічнага зместу поліпарадыгмальнай духоўнай культуры.

У духоўнай культуры XIX ст. імпліцытна прысутнічае тая спецыфіка пазнання, пераўтварэння і духоўнага засваення рэчаіснасці, якая пачынае вызначаць нацыянальны каларыт. Аксіялагічны змест духоўнай культуры XIX ст., выўлены ў мастацкай творчасці, утварае адмысловую *“праграму жыццяўстойлівасці”*, якая забяспечвае гарманічнае існаванне этнічнай супольнасці ў зменлівай рэчаіснасці, адлюстроўвае рэальныя духоўныя рэсурсы будучай нацыі. Дадзеную праграму складаюць каштоўнасці, якія рэгулююць існаванне чалавека ў грамадстве і рэфлексіўныя аксіялагемы, якія забяспечваюць самазахаванне, унутраную гармонію асобы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сэнсавае напаўненне выяўленых аксіялагем абумоўлена народна-хрысціянскай сістэмай светапоглядных каардынат. Рэфлексіўная дзейнасць суб'ектаў беларускай духоўнай культуры XIX ст. выразна зарыентавана на сцверджанне маральна-этычных асноў жыцця, пра што сведчыць каштоўнаснае пераасэнсаванне такіх катэгорый, як *праца, паўсядзённасць, Радзіма, свой кут, сям'я, грамада, памяць, жыццё, Бог, прырода, любоў, прыгажосць і дабрачыннасць, людскасць.* Для інтэрпрэтацыі большасці аксіялагем характэрна дамінаванне агульначалавечай накіраванасці, якая абумовіла далейшую самаматывацыю і самарэгуляцыю, вытокі гістарычнага народнага аптымізму беларускага народа.

Інтэрпрэтацыя аксіялагемы *любові* ў хрысціянскім разуменні (спагада, міласэрнасць, людскасць) прысутнічае ў творах А. Міцкевіча, В. Каратынскага, Я. Баршчэўскага, Я. Чачота, Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, В. Дуніна-Марцінкевіча. Такія аксіялагічныя дамінанты, як сціпласць, ашчаднасць, гаспадарлівасць, гасціннасць, стрыманасць, шчодрасць, спагада, спачуванне, знайшлі ўвасабленне ў *парадыгме дбайнага гаспадара*, прадстаўленай у мастацкай культуры XIX ст. не толькі вобразамі справядлівага князя, пана, уладара, шляхціца, але і вобразамі прадстаўнікоў з сялянскай субкультуры. Жыццёвая ўстойлівасць, цярплівасць селяніна ў часы ліхалецця абумовіла такую каштоўнасную рысу, як *народны віталізм* ("абяздолены, але жывучы"), здольнасць да самазахавання ў неспрыяльных умовах. Паўсядзённыя клопаты, праца на гаспадара адшліфавалі гэтую здольнасць да ўнікальнай. Агульнае па шкале каштоўнасцей беларускай духоўнай культуры ацэньваецца вышэй за асабістае, што выразна прсочваецца ў творчасці Я. Баршчэўскага, К. Марашэўскага, Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, В. Дуніна-Марцінкевіча, В. Каратынскага.

Асаблівасцю мастацкага пераасэнсавання каштоўнасці *прыроды* ў творах з'яўляецца падкрэсліванне адзінства ва ўспрыняцці чалавека і прыроднага свету. Беларуская аксіялогія захоўвае ў сваім змястоўным падмурку канцэпт антрапапрыроднай гармоніі. Духоўная энергія носьбіта культуры канцэнтравалася на сваёй тэрыторыі, што абумоўлівае характэрную для беларускай традыцыі канцэнтрацыю каштоўнасцей не ў трансцэндэнтным, а ў рэальным свеце, на "сваёй зямлі", у канкрэтна абазначаным ландшафце. Гарманічнае суіснаванне прыроднага і чалавечага космасаў назіраецца ў пейзажах В. Дмахоўскага, А Гараўскага, І. Гараўскага.

У аксіялагеме зямлі, Радзімы, Айчыны, роднага краю ўвасоблена значная духоўная каштоўнасць – *памяць пра продкаў*, пра свае карані. Пусціць карані ў часе і прасторы – абавязковая ўмова існавання супольнасці. Каштоўнаснае пераасэнсаванне памяці пра продкаў і сям'і базуюцца на *повязі* як сэнсавай дамінанце, ідэйным механізме злучанасці паміж мінулым і будучым на аснове кроўнай, суседскай, сацыяльнай, этнічнай і ў перспектыве – нацыянальнай паяднанасці. У такой пазіцыі бачыцца адлюстраванне аксіялагічнага канцэпта *грамады* як тыповага беларускага сацыяльнага ўніверсуму. Паводле прынцыпаў грамады дзейнічалі патэрны і нормы маралі, якія фарміравалі духоўнае аблічча будучай беларускай нацыі. Такія каштоўнасныя арыентацыі, як салідарнасць, узаемадапамога, адказнасць, абавязак знайшлі пераасэнсаванне ў творчасці А. Міцкевіча, Я. Баршчэўскага, В. Каратынскага, У. Сыракомлі, В. Дуніна-Марцінкевіча. Аксіялагема сям'і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лягла ў аснову твораў выяўленчага мастацтва, сярод якіх можна вылучыць партрэтныя работы Я. Аляшкевіча "Групавы партрэт", "Партрэт дзяўчынкі", "Мадонна з дзіцём", В. Ваньковіча "Партрэт жонкі з дзецьмі", А. Ромера "Пінская мадонна", Р. Жукоўскага "Партрэт пяцярых дзяцей беларускага паўстанца". На аснове повязі заснаваны многія моманты сямейна-абрадавай галіны жыцця беларускага народа, што знайшло пераасэнсаванне ў мастацкай творчасці (абрад памінання продкаў ў паэме А. Міцкевіча "Дзяды" сведчыць пра магчымасць выратавання душы памерлага праз дапамогу з боку жывых нашчадкаў).

Аксіялагічнае пераасэнсаванне ў творчасці суб'ектаў культуры XIX ст. атрымала катэгорыя *мовы* як фактар кансалідацыі грамадства, які выконвае трансляцыйную функцыю культуры, адлюстроўвае сацыякультурны досвед супольнасці і выяўляе нацыянальную адметнасць: К. Марашэўскі, Ф. Багушэвіч, В. Дунін-Марцінкевіч, Я. Лучына.

***У падраздзеле 2.2 "Увасабленне дамінуючых грамадскіх ідэалаў беларускай культуры ў розных сацыякультурных парадыгмах XIX ст."*** разглядаюцца дамінуючыя грамадскія ідэалы, выяўленыя ў мастацкіх творах XIX ст.

Ідэал вылучаецца ў якасці аднаго са структурных элементаў сацыякультурных парадыгмаў XIX ст. Ён вызначае накірунак дзеяння супольнага суб'екта культуры, спосаб вырашэння жыццёва значных задач, вектар актыўнасці, перспектыву далейшага развіцця.

Аксіялагічнае артыкуляванне і інтэрпрэтацыя ідэалаў у мастацкай творчасці XIX ст. адбываецца ў агульнаэтнічнай форме, паколькі ідэалы выступаюць у якасці культурных сэнсаў, аб'ектывізаваных досведам супольнасці. Менавіта таму на аснове ідэалаў, выяўленых у творчасці суб'ектаў беларускай культуры XIX ст., можна акрэсліць *"праграму актыўнага дзеяння"*, якая ўключае ў сябе варыянты паводзін супольнасці ў імкненні да рэалізацыі дадзенага ідэала ў рэчаіснасці, спосабы мабілізацыі агульных высілкаў падчас пагрозы знешніх і ўнутраных дэструктыўных фактараў.

Ідэал можа скіроўваць да *пасіўнага (негвалтоўнага) супраціву* шляхам маральнага ўдасканалення, пераадолення комплексу непаўнавартасці шляхам выхавання пачуцця ўласнай годнасці, асветы народа і абуджэння імкнення да набыцця ведаў, добрасумленнай працы на карысць гаспадара (адсутнасць эгаізму), цярплівасці і боскай пакоры ў выпрабавальных пакутах.

Разам з тым ідэал можа матываваць асобнага чалавека і супольнасць да *актыўнай барацьбы, адкрытага змагання*, абароны свайго краю ў крызісны перыяд пагрозы поўнай асіміляцыі і знікнення праз пераўтварэнне энергіі пакут і цярплівасці ў энергію актыўнага дзеяння, накіраванага на пераадоленне несправядлівасці, маральна апраўданую барацьбу, усвядомленую ахвярнасць. Ідэал вызначаў характар мяркуемага супраціву супольнасці пры патрэбе захавання пасіянарнасці, фарміраваў этнічна свядомы тып асобы.

У якасці ідэала, што актуалізуе *пасіўны супраціў*, у многіх суб'ектаў культуры XIX ст. выступае паўсядзённае жыццё са звыклымі клопатамі. Гэта акалічнасць пазітыўнага стаўлення да рэчаіснасці ўказвае на збліжэнне культурнага ідэала і рэчаіснасці, характэрнае для беларускай духоўнай культуры. Сапраўднае каштоўнаснае пераасэнсаванне набываюць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

простыя побытавыя рэчы, і асобны чалавек у хранатопе паўсядзённасці ўспрымаецца як ідэал гарманічнага існавання. Падобная інтэрпрэтацыя ідэала паўсядзённасці назіраецца ў творах В. Дуніна-Марцінкевіча, У. Сыракомлі, А. Міцкевіча, Э. Ажэшкі. Ідэалізацыя звыклых момантаў, цікавасць да прадметаў побытавага свету, паэтызацыя айкумены праявіліся ў бытавых замалёўках І. Хруцкага “У пакоі сядзібы мастака. Дзеці перад мальбертам”, у партрэтах К. Русецкага “Жняя”, “Ліцвінка з вербамі”, К. Альхімовіча “Сельская дзяўчына”, “Жніво”, Н. Сільвановіча “Партрэт дзяўчынкі”, “Ліцвінка ў Ёзне”, дзе мастацкая рэфлексія скіравана на пераасэнсаванне ў ідэальнай форме паўсядзённых момантаў працы, святочных клопатаў ці іншых штодзённых спраў, якія складаюць ціхія радасці няспыннай жыццёвай плыні.

Адным са шляхоў удасканалення існуючай сацыякультурнай сітуацыі паводле суб’ектаў культуры XIX ст. была *арыентацыя на мінулае* як узор у арганізацыі гарманічнай жыццядзейнасці на ўзроўні супольнасці, у чым бачыцца праява міфа “залатога стагоддзя”. Ідэал мінулага ў розных мадыфікацыях (гады юнацтва і змагарнай маладосці, мінулыя часы патрыярхальнага ладу, перыяд ВКЛ, замілаванне старасветчынай, часамі былой славы шляхецкіх родаў, іх сармацкай велічы) інтэрпрэтуецца як “залатыя часы” ў творчасці А. Міцкевіча, Я. Баршчэўскага, Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, В. Дуніна-Марцінкевіча, К. Каліноўскага, В. Каратынскага, У. Сыракомлі.

У аўтарскай інтэрпрэтацыі ідэала эканамічнай, палітычнай, сацыяльнай і асабістай *свабоды* або *волі* падкрэсліваецца, што для беларускага народа яна азначала не толькі вызваленне з-пад прыгнёту, але і выступала праявай рашучасці ў волевыяўленні, здольнасці здзяйснення самастойнага выбару ўласнага шляху. У творах Ф. Багушэвіча (“У астрозе”), К. Каліноўскага (“Мужыцкая праўда”), В. Дуніна-Марцінкевіча (“Гапон”), Я. Лучыны (“Вясна”), К. Каліноўскага (“Мужыцкая праўда”) назіраецца супольная тэндэнцыя змагання за вызваленне (асабістае і нацыянальнае). Ідэал свабоды ўсведамляўся ў мастацкай культуры як магчымасць мець Радзіму, свой кут, які быў адабраны. Ідэал свабоды ў мастацкім пераасэнсаванні XIX ст. мяжуе з катэгорыяй адказнасці за захаванне свайго краю, грамадскага абавязку, які выступаў у якасці канстанты жыццядзейнасці.

Адкрытае змаганне актуалізуецца мастацкім пераасэнсаваннем ідэальнай катэгорыі *праўды*. На аснове праўды суб’ектамі культуры XIX ст. не толькі спасцігаецца сапраўдная сутнасць рэчаў і з’яў, адпаведнасць вядомага наяўнаму, але і прадпрымаюцца спробы карэкціроўкі рэальнасці праз барацьбу. Праўда народнай справядлівасці (“мужыцкая праўда”) выступае ў якасці ідэацыйнага канцэпта ў творчасці К. Каліноўскага, Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, В. Дуніна-Марцінкевіча, В. Каратынскага.

Ідэал *сацыяльнага яднання, сацыяльнай і этнічнай кансалідацыі*, “згоды”, “замірэння” грамады выступае як неабходная ўмова супольнай барацьбы. Ідэя паразумення і згоды ўнутры і паміж саслоўямі, ідэалізацыя вобраза “добрага пана”, які па-бацькоўску апякуецца селянінам, фарміравала патэрналісцкі ідэал. Падобная інтэрпрэтацыя сямейнай і сацыяльнай злучанасці назіраецца ў творах В. Каратынскага “Уладзіславу Сыракомлю”, Я. Лучыны “Паляўнічыя акварэлькі з Палесся”, В. Дуніна-Марцінкевіча “Блаславёная сям’я”, “Ідылія”,

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

А. Міцкевіча “Пан Тадэвуш”, К. Альхімовіча “Дажынкі”. У беларускім жывапісе XIX ст. вектар актыўнага змагання, барацьбы за свабоду і праўду ідэалізуюцца ў творчасці Ф. Смуглевіча “Прысяга Т. Касцюшкі на Кракаўскім рынку”, І. Аляшкевіча “Развітанне гетмана Хадкевіча з жонкай перад Хоцімскай бітвай”, Ю. Пешкі “Ахвяраванне мячоў Ягайле перад бітвай”, Я. Сухадольскага “Бітва пад Грунвальдам”, К. Альхімовіча “Абарона Ольштына”, М. Андрыёлі “Партрэт Л. Нарбута”, “Сцэна з літоўскага паўстання”, “Атака паўстанцаў”, “Вылазка паўстанцаў”, “Бітва ліцвінаў з крыжакамі”, А. Ромера “Партрэт паўстанца 1863”, Я. Дамеля “Смерць Глінскага ў няволі”, Я. Сухадольскага “Смерць Кіпрыяна Гадэбскага…”, “Смерць Юзафа Панятоўскага”, “Сцэна з паўстання 1831”, М. Андрыёлі “Смерць Л. Нарбута пад Дубічамі”, К. Альхімовіча “Смерць М. Глінскага ў турме”. Звяртаючыся да адлюстравання драматычна-гераічных момантаў гісторыі, суб’екты культуры XIX ст. сцвярджалі здольнасць супольнасці да гераізму ў самаахвярным змаганні за свабоду Айчыны. Падзеі і асобы з гісторыі неўзабаве пачалі ўваходзіць у кодавую сістэму нацыянальнай культуры і набываць не толькі ідэальны, але і сімвалічны сэнс.

***У падраздзеле 2.3 “Інтэрпрэтацыя этнакультурных архетыпаў і сімвалаў у творчай спадчыне суб’ектаў культуры XIX ст.”*** выяўляецца адметнасць інтэрпрэтацыі архетыпічных вобразаў і базісных сімвалаў у мастацкай творчасці суб’ектаў культуры XIX ст.

Сімвалічны ўзровень у межах структуры сінтэзаваных сацыякультурных парадыгмаў XIX ст. прадстаўлены агульным для духоўнай культуры наборам архетыпаў, увасобленых у сімвалах і архетыпічных вобразах. Этнанацыянальныя архетыпы, пераасэнсаваныя суб’ектамі мастацкай творчасці, валодаюць моцным патэнцыялам на пачатковым этапе станаўлення беларускай нацыянальнай культуры XIX ст.

Да архетыпаў, вобразна ўвасобленых у мастацкай творчасці XIX ст., можна аднесці ключавыя ўніверсальныя архетыпы *ценю, героя, анімы, анімуса, мудрага старца, персоны, самасці* (цэласнасці), а таксама этнакультурныя архетыпы *Маці-Зямлі, Музыкі/Песні* і інш. Не апошнюю ролю ў межах духоўнай культуры XIX ст. адыгралі сімвалы: *гара, дарога, возера, хата, астрог, свечка, вецер, агонь, крыж, могілкі, здань* – іх звыклае семантычнае напаўненне было пашырана новымі канатацыямі.

У межах творчасці суб’ектаў беларускай культуры XIX ст. часта фігуруе этнакультурны архетып *Маці-Зямлі* (або яго сінанімічныя варыянты *Радзімы-жанчыны, Радзімы-Маці*), звязаны з аксіялагемай жыцця, свабоды, зямнога раю, увасобленых у канататах *нівы, руні, зерня, хлеба.* Архетып *мудрага старца*, увасоблены ў сімвалах вандроўніка, пустэльніка, жабрака, селяніна-апавядальніка, фігуруе ў станоўчым аспекце як транслятар досведу і спрадвечнай праўды і мудрасці ў творчасці Я. Барчшэўскага, А. Міцкевіча, Я. Чачота.

Вызначальнымі ў мастацкай культуры XIX ст. з’яўляюцца архетып *героя* і *самасці (цэласнасці)*. Герой імкнецца зрабіць свет лепшым, змяніць недасканалую сітуацыю, усталяваць справядлівасць, паўстае на змаганне са злом, здольны на бунт і ахвяру для дасягнення высакароднай мэты. Накірунак супраціву і сродкі барацьбы, якія абірае герой для

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пераўтварэння рэчаіснасці, абумовілі ўвасабленне архетыпа ў розных вобразах-мадыфікацыях у адпаведнасці з характарам супраціву: *асветнік, рэфарматар* (падобная мадыфікацыя архетыпа героя сустракаецца ў творчасці Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча), *паэт-абуджальнік, лірнік-вяшчун, музыка-творца* (дамінуе ў творчасці А. Міцкевіча (Густаў-Конрад у паэме "Дзяды"), У. Сыракомлі (вясковы лірнік), В. Каратынскага, Ф. Багушэвіча (Мацей Бурачок), *абаронца, ваяр, змагар* (мастацкія вобразы рэальных культурных і нацыянальных герояў Т. Касцюшкі, Т. Рэйтана, І. Дамейкі, Л. Нарбута, Т. Зана, Я. Ясінскага, Т. Ваўжэцкага, Э. Плятэр – актыўных суб'ектаў нацыятворчага працэсу, якія ў свой час гераічна змагаліся супраць дэспатызму за ідэал свабоды). Супрацьстаянне аднаго, адлюстраванае ў вобразах архетыпа героя, неўзабаве становіцца каштоўнасцю для ўсёй супольнасці: *я супрацьстаю – адпаведна, мы існуем*.

Сімвалічнае ўвасабленне архетыпа *самасці* ў творчай спадчыне суб'ектаў духоўнай культуры XIX ст. назіраецца праз матыў вечнага вяртання: герой аднаўляе гармонію ў свеце, ва ўласнай душы і лёсе і тым самым вяртае да балансу, замыкае кола. Большасць сімвалаў-мадыфікацый архетыпа героя, увасобленых у мастацкай творчасці, ілюструюць працэс станаўлення асобы. Характар дзейнасці па ўдасканаленні рэчаіснасці распасціраецца ад хаатычнага асабістага бунту і бясконцых пошукаў праз пераарыентацыю ўвагі з індывідуальнага на супольны вектар да асэнсаванага змагання з несправядлівасцю ў дачыненні да свайго народа і чалавецтва ў цэлым (Густаў-Конрад, Яцак Сапліца, Кастусь Каліноўскі, Караль Лятальскі, герой-апавядальнік з твора Я. Баршчэўскага). Герой не можа існаваць адасоблена ад свайго народа, яго дзейнасць з'яўляецца не толькі асабістым, але і супольным досведам у агульнай справе. Такое сінтэзаванае ўвасабленне дадзеных архетыпаў у мастацкай культуры XIX ст. адлюстроўвае працэс індывідуалізацыі, духоўнай эвалюцыі героя, узыходжанне яго да цэласнасці (самасці), рэалізацыю яго здольнасці на сапраўдны бунт у імя вышэйшай мэты і набліжэнне да першавобраза Бога.

Архетыпічны вобраз *раба* як мадыфікацыя вобраза героя ўвасоблены ў літаратуры і жывапісе праз сімвалы нявольніка, слугі, прыгоннага. Базавы прынцып інтэрпрэтацыі архетыпа – падкрэсленая адсутнасць магчымасці распараджацца сваім жыццём і ўласным лёсам. Само жыццё ўспрымаецца як *вязніца, астрог*. У архетыпе раба складана перапляталіся супярэчлівыя тэндэнцыі: жаданне вызваліцца, добрасумленная праца на карысць гаспадара-прыгонніка, пераўзыходжанне яго па маральных якасцях, страх ад ініцыятывы існуе поруч з імкненнем пабыць у ролі гаспадара. Дадзены сімвал атрымаў сваё пераасэнсаванне ў творчасці А. Міцкевіча, Ф. Багушэвіча, У. Сыракомлі, Я. Чачота, К. Альхімовіча, Ю. Азямблоўскага. Наступнай прыступкай у рэфлексіі вобраза раба павінна стаць усведамленне неабходнасці вызвалення і пераадолення ўласнага рабскага становішча, маральнае і сацыяльнае вызваленне.

Архетып *анімы* ўвасоблены ў большасці жаночых персанажаў, напрылад, у творах А. Міцкевіча: Зоська ў паэме "Пан Тадэвуш", Марыля ў "Дзядах", Гражына ў баладзе "Гражына"; Марыська ў вершы К. Каліноўскага і інш. Яны пакліканы стымуляваць героя на змаганне, спрыяць гартаванню яго рашучасці, садзейнічаць станаўленню выключнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Архетып героя цесна звязаны з архетыпам *ценю,* інтэрпрэтаваным суб'ектамі мастацкай творчасці ў розных сімвалічных мадыфікацыях, аб'яднаных негатыўнай канатацыяй: вобразы *ворагаў* (цар, імперская палітыка, паны-прыгоннікі, асаднікі, аканомы, суддзі, афіцэры, нячыстая сіла, а таксама варожых чужынцаў (звычайна разумеецца іншы этнас: “маскалі”, татары) – усе тыя, што замінаюць гарманічнаму развіццю, парушаюць звыклы парадак існавання супольнасці. Архетыпічныя вобразы ценю, выяўленыя ў мастацкай культуры XIX ст., акрамя калектыўнай формы, таксама адлюстроўваюць пераважна негатыўныя рысы асобы: *невуцтва, беспамяцтва, абыякавасць, пыха, бязбожнасць, зняверанне, нігілізм, адарванасць ад каранёў, здрада ўласнаму сумленню і народу.*

Топас *дома,* роднай хаты разглядаецца як сканцэнтраванне асноўных жыццёвых каштоўнасцей, скіраванае на жыццёвую неабходнасць пабудаваць свой утульны дом, якое інтэрпрэтавана ў творчасці як імкненне стварыць светлую будучыню ў сваім краі. У адрозненне ад пазітыўнай семантычнай напоўненасці дадзенага сімвала ў творчасці тагачасных суб'ектаў культуры часта сустракаецца “чужы дом”, або “пусты дом”, “пустка”, “могільнік”, “папялішча”, што абумоўлена гістарычным кантэкстам: стратай дзяржавы.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

**Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі**

1. Сацыякультурная парадыгма з'яўляецца феноменам культурнай цэласнасці, выяўленай у працэсе культурна-гістарычнага развіцця. Адметнасцю сацыядынамікі беларускай духоўнай культуры XIX ст. выступае *поліпарадыгмальнасць*, пад якой варта разумець сінтэзаваную разнастайнасць парадыгмальных накірункаў, іх узаемадзеянне і ўзаемаўплыў у межах аднаго культурнага поля і эпохі. Поліпарадыгмальнасць ззаснавана на ўзбагачэнні ідэй папярэдняй сацыякультурнай парадыгмы за кошт новаўвядзенняў наступнай. Дадзены факт знайшоў сваё выразнае адлюстраванне ў мастацкай спадчыне суб'ектаў культуры, дзе спалучаліся элементы асветніцкай, рамантычнай, дэмакратычна-рэалістычнай сацыякультурных парадыгмаў XIX ст.

Асноўнымі рысамі *поліпарадыгмальнасці* як вызначальнай адметнасці сацыядынамікі беларускай духоўнай культуры XIX ст. з'яўляюцца:

- суіснаванне ў межах акрэсленага часавага перыяда асветніцкай, рамантычнай і рэалістычна-дэмакратычнай сацыякультурных парадыгмаў;
- адсутнасць радыкальнага ідэйнага супрацьстаяння розных сацыякультурных парадыгмаў: меў месца сінтэз ідэй, прадуктыўны для выкрышталізоўвання ўласнай адметнасці. Наступная парадыгма ў межах беларускай сацыякультрунай сітуацыі развіцця духоўнай культуры XIX ст. не адмаўляла папярэднюю, а сінтэзавала яе ідэі з уласнымі (беларускай рамантычнай парадыгме было ўласціва арганічнае спалучэнне рацыянальнага і інтуітыўнага, трансцэндэнтнага і рэальнага, матэрыяльнага і духоўнага, эмоцыі і пачуццё дапаўнялі рацыянальнасць у спасціжэнні свету);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- спалучэнне ў светапоглядзе суб'ектаў культуры аспектаў розных сацыякультурных парадыгмаў, арыентацыя творчай рэфлексіі на каштоўнасці розных парадыгмальных накірункаў (народна-хрысціянская аксіялогія ўраўнаважваецца ідэаламі рыцарскай эпохі);
- увасабленне розных сацыякультурных парадыгмаў не толькі на ідэйным, тэарэтычным, але і на дзейнасным, парктычным узроўнях актыўнасці суб'ектаў культуратворчасці (ідэалы рамантычнай парадыгмы ва ўзаемадзеянні з асветніцкімі ідэаламі роўнасці, праўды і справядлівасці абумовілі светапогляд філаматаў, матывавалі іх грамадскую актыўнасць і творчую дзейнасць, паўплывалі на ўдзел многіх суб'ектаў культуры ў нацыянальна-вызвольнай барацьбе);
- паступовы тэмп сацыядынамікі духоўнай культуры без рэзкай ломкі папярэдняй светапоглядавай асновы, што выявілася ў паслядоўнай змене сацыякультурных парадыгмаў без яскравых радыкальных пераваротаў шляхам сінтэзу папярэдніх і наступных ідэй. Кожная наступная парадыгма была заснавана на адаптаванні да папярэдніх дамінуючых сэнсаў і дапаўненні іх новымі адценнямі на аснове пераасэнсавання і прыстасавання да актуальнай сацыякультурнай сітуацыі (новых палітычных і сацыяльных рэалій, а таксама ў адпаведнасці з ментальнымі асаблівасцямі беларускага народа). Беларуская нацыянальная культура паўставала эвалюцыйным, натуральным шляхам, нягледзячы на неспрыяльнасць умоў. Нацыянальна-вызваленчы рух у дынаміцы эпохі выступае заканамернай з'явай на шляху нацыянальнага самавызначэння, паколькі ён не разбураў папярэднія сэнсы, а рэалізоўваў іх на практыцы [3; 8; 9; 12; 17; 18; 23; 24].

2. Адметнасць інтэрпрэтацыі каштоўнасцей ў творчай спадчыне суб'ектаў культуры XIX ст. абумоўлена сінтэзам як вызначальным сэнсавым і метадалагічным аспектам поліпарадыгмальнасці. Большасць аксіялагем, выяўленых у мастацкай спадчыне суб'ектаў культуры XIX ст., адносіцца да хрысціянскай і да народнай сістэмаў светапоглядавых каардынат. Сінтэтычная адметнасць інтэрпрэтацыі выяўлена праз відавочную цесную зн'ітаванасць прыродных, эстэтычных, маральных, рэлігійных аксіялагем. Сукупнасць аксіялагем духоўнай культуры XIX ст. уяўляе сабой “праграму жыццяўстойлівасці”, якая забяспечвае трываласць, абумоўлівае вітальную сілу народа ў крызісны перыяд, калі неабходнай умовай было самазахаванне, пошук і зберагання асновы для наступнага развіцця супольнасці. “Праграму жыццяўстойлівасці” складаюць дзве групы аксіялагем, класіфікаваных у адпаведнасці з аспектам жыццядзейнасці, захаванне якога дадзеныя каштоўнасці забяспечваюць:

- аксіялагемы, якія забяспечваюць існаванне чалавека ў супольнасці, грамадстве; сукупнасць каштоўнасцей, аб'яднаных у парадыгме гаспадара, аксіялагемы, абумоўленыя каляндарна-земляробчай культурнай традыцыяй (праца, гасціннасць, антрапапрыродная гармонія, шчодрасць і ашчаднасць, шчырасць, ціхія радасці зямнога існавання), а таксама каштоўнасці хрысціянскага характару (любоў ва ўсіх праявах, міласэрнасць, сям'я, спагада, спачуванне);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- рэфлексіўныя каштоўнасці, накіраваныя на самазахаванне, унутраную гармонію чалавека: вышэйшая хрысціянская каштоўнасць (Бог), годнасць, сумленнасць, сціпласць, свабода волі, адказнасць, патрыятызм, імкненне да самаўдасканалення, набыцця ведаў, шанаванне продкаў, краса як эстэтычнае абагульненне прыгожага ў самасвядомасці этнасу, зямля і прырода [1; 6; 11; 14; 16; 19; 20; 22].

Дадзеную аксіялагічную “праграму жыццяўстойлівасці” характарызуе статычнасць, перманентнасць, яна існуе ў латэнтным модусе, у рэжыме захавання таго, што ёсць. У прадуктыўную форму яна пераходзіць тады, калі гаворка ідзе не аб захаванні, а аб мэтанакіраваным пераўтварэнні існуючай сацыякультурнай сітуацыі – дадзеная акалічнасць прадстаўлена ў мастацкай творчасці XIX ст. праз адметную інтэрпрэтацыю дамінуючых грамадскіх ідэалаў.

3. Пераасэнсаванне грамадскіх ідэалаў суб’ектамі мастацкай творчасці XIX ст. абумоўлена дынамічным характарам ідэала, здольнасцю адлюстравання пажаданага ва ўмовах неабходнасці ўдасканалення сацыякультурнай сітуацыі. У якасці дамінуючых грамадскіх ідэалаў XIX ст. выступаюць ідэал мінуўшчыны (маладосці, ліцвінскага часу), ідэал вяртання страчанай Радзімы, ідэал свабоды, ідэал “мужыцкай” (“сваёй”) праўды, ідэал народа як самастойнага суб’екта жыццядзеяння, ідэал сацыяльнай і этнічнай паяднанасці супольнасці. Інтэрпрэтацыя ідэалаў абумоўлівае “праграму актыўнага дзеяння” супольнасці па рэалізацыі і дасягненні ідэалаў у рэчаіснасці. Сродкамі рэалізацыі пералічаных ідэалаў у межах праграмы, выразна прадстаўленымі ў творчай спадчыне суб’ектаў культуры XIX ст., выступаюць *негвалтоўны пасіўны супраціў* шляхам асветы, стваральнай дзейнасці, заканамернага рэфармавання розных сфераў, добрасумленнай працы, захавання боскай пакоры, цярплівасці і маральнасці. Негвалтоўны супраціў знаходзіцца ў сінтэтычным паяднанні з формай *актыўнага супраціву* ў змаганні, адкрытай барацьбе і абароне свайго краю. Варта падкрэсліць, што дадзеныя ідэалы, будучы сфармуляванымі і абумоўленымі пэўным культурным кантэкстам, могуць выходзіць за межы канкрэтнага часавага перыяда, укараняцца ў вечнасці па сродках мастацкай рэфлексіі ў “праграме актыўнага дзеяння”, да якой можа звярнуцца нацыя ў выпадку пагрозы з боку дэструктыўных фактараў [2; 4; 13; 15; 21; 26].

4. Да дамінуючых архетыпаў у межах духоўнай культуры XIX ст. патрэбна аднесці архетып героя, прадстаўленага ў розных вобразах-мадыфікацыях: асветніка, змагара, ахоўніка, абаронцы, творцы, рэфарматара, гаспадара), самасці, персоны, мудрага старца, анімы, ценю, Маці-Зямлі, Музыкі/Песні. Аксіялагічны аналіз інтэрпрэтацыі сімвалічных структур у мастацкай творчасці паказвае абумоўленасць іх прачытання ў сістэме актуальнай на той час сацыякультурнай сітуацыі, дзякуючы чаму многія базісныя сімвалы атрымліваюць дадатковыя семантычныя адценні: крыж як сімвал смерці ў выгнанні, пустка як сімвал забытага, знявечанага краю, пусты дом як сімвал разрабаванай чужымі гаспадарамі Бацькаўшчыны, пажарышча як сімвал безгаспадарлівасці, абыякавасці – інтэрпрэтацыя дадзеных сімвалаў у літаратурных творах і творах жывапісу XIX ст., выступаючы мастацкай рэфлексіяй на тагачасную сацыякультурную сітуацыю, дазваляе спрагназаваць у выпадку

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

неабходнасці пажаданасць таго ці іншага дзеяння этнасу дзеля сцвярджэння свайго пасіянарнага статусу ў гісторыі [5; 7; 24; 25].

Такім чынам, праз інтэрпрэтацыю аб'ектаў духоўнай культуры ў мастацкай творчасці на этапе нацыянальнага станаўлення XIX ст. можна выявіць уласны аксіялагічны змест духоўнай культуры, прадстаўлены "праграмай жыццяўстойлівасці" (наборам маральных прынцыпаў, матыватараў, рэгулятываў, якія абумоўліваюць магчымасць гарманічнага існавання беларускай нацыі ў свеце) і "праграмай актыўнага дзеяння" (пералікам магчымасцяў, якія пацвярджаюць здольнасць супольнасці да дзейнасці, накіраванай на рэфармаванне і змяненне рэчаіснасці, пераадоленне крызісу і супраціў дэструктыўным фактарам).

**Рэкамендацыі па практычным укараненні вынікаў дысертацыі**

Практычная значнасць вынікаў даследавання абумоўлена сувяззю з актуальнымі праблемамі сучаснага развіцця беларускай нацыянальнай культуры. Матэрыялы даследавання дазваляюць пашырыць сучасную культуралагічную навуку ў галіне інтэрпрэтацыі культурнай спадчыны, а таксама ў галіне прымянення катэгорыі сацыякультурнай парадыгмы ў дачыненні да аналізу гісторыка-культурнай эпохі. Атрыманыя вынікі садзейнічаюць далейшаму вывучэнню закранутых у дысертацыйным даследаванні пытанняў. Вынікі даследавання ўведзены ў вучэбны працэс УА "БДУКМ" пры выкладанні дысцыплін "Тэорыя і гісторыя культуры" (акт аб практычным укараненні вынікаў НДР ад 24.04.2013 г.); "Гісторыя культуралагічнай думкі Беларусі" (акт аб практычным укараненні вынікаў НДР ад 15.05.2013 г.); у працэс выкладання вучэбнага прадмета "Беларуская літаратура" ДУА "Гімназія № 1 г. Дзяржынска (акт аб практычным укараненні вынікаў НДР ад 19.06.2014 г.).

Матэрыялы дысертацыйнага даследавання садзейнічаюць паглыбленню і развіццю тэорыі і гісторыі айчыннай культуры. Разгледжаны факталагічны матэрыял, асноўныя палажэнні і вынікі праведзенага даследавання могуць быць выкарыстаны ў далейшых навуковых распрацоўках па праблеме культуралагічнай інтэрпрэтацыі мастацкай спадчыны ў сацыякультурным кантэксце эпохі, у лекцыйных курсах па фундаментальнай культуралогіі, тэорыі і гісторыі айчыннай культуры, тэорыі і гісторыі мастацтва, аксіялогіі культуры, гісторыі беларускай літаратуры XIX ст. Атрыманыя вынікі маюць непасрэднае значэнне для развіцця сучаснай нацыянальнай культуры Беларусі, у прыватнасці, для пераасэнсавання культуры мінулага, выяўлення ідэйнай пераемнасці сучаснасці з папярэдняй гісторыка-культурнай эпохай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

### Артыкулы ў навуковых рэцэнзаваных часопісах і зборніках

1. Жылко, У. А. Аксіялагічныя дамінанты этнакультуры беларусаў у творчасці Яна Баршчэўскага / У. А. Жылко // Веснік Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – Мінск, 2011. – Вып. 2 (16). – С. 5–12.

2. Жылко, У. А. Увасабленне аб'ектаў ідэацыйнай культуры ў беларускім рамантызме XIX ст. (на прыкладзе творчасці Яна Баршчэўскага) / У. А. Жылко // Искусство и культура. – Витебск, 2012. – Вып. 2. – С. 65–70.

3. Жылко, У. А. Парадыгмы сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства першай паловы XIX ст. / У. А. Жылко // Искусство и культура. – Витебск, 2013. – Вып. 2 (10). – С. 97–108.

4. Жылко, У. А. Увасабленне дамініруючых грамадскіх ідэалаў у творчасці суб'ектаў рамантычнай культурнай парадыгмы / У. А. Жылко // Веснік Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – Мінск, 2014. – № 1 (21). – С. 34–42.

5. Жылко, У. А. Увасабленне архетыпа героя ў творчай спадчыне суб'ектаў беларускай культуры XIX ст. / У. А. Жылко // Вестн. Полоцк. гос. ун-та. Сер. E, Педагогические науки. – Новополоцк, 2015. – № 15. – С. 116–119.

### Артыкулы ў навуковых зборніках

6. Жылко, У. А. Аксіялагічныя складнікі беларуска-польскага рамантызму XIX ст. / У. А. Жылко // Универсальное и национальное в культуре : сб. науч. ст. – Минск : Издат. центр БГУ, 2012. – С. 293–305.

7. Жылко, У. А. Увасабленне этнапрасторы ў творчай спадчыне Я. Баршчэўскага / У. А. Жылко // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : сб. науч. ст. / ГрГУ им. Я. Купалы ; редкол. : М. А. Можейко (гл. ред.) [и др.]. – Гродно : ГрГУ, 2012. – С. 289–292.

8. Жылко, У. А. Асветніцкая парадыгма сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства пач. XIX ст. / У. А. Жылко // Культура: открытый формат – 2012 : сборник научных статей. – Минск : БГУКИ, 2013. – С. 45–49.

9. Жылко, У. А. Сацыякультурныя супярэчнасці як фактар змены культурна-гістарычных парадыгмаў (на прыкладзе беларускай культуры XIX ст.) / У. А. Жылко // Культура: открытый формат – 2013 : сборник научных статей / Белорусский государственный университет культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2013. – С. 71–75.

10. Жылко, У. А. Дамінуючыя ідэалы рэалістычнай парадыгмы сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства XIX ст. / У. А. Жылко // Інтэрпрэтацыя сімвала ў нацыянальнай культуры : зб. навук. арт. XXXIX навуковая канферэнцыя студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў БДУКМ, 26 сак. 2014 г. – Мінск : БДУКМ, 2015. – С. 41–46.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

11. Жылко, У. А. Аксіялагемы этнакультуры беларусаў у творчасці Я. Баршчэўскага / У. А. Жылко // Актуальныя праблемы мастацтва: гісторыя, тэорыя, методыка : матэр. II міжнар. навук.-практ. канф., Мінск 7–8 красав. 2011 г. – Мінск : БДПУ, 2011. – С. 52–53.

12. Жылко, У. А. Роля моўнага чынніка на пачатковым этапе фарміравання нацыянальнай самасвядомасці (пач. XIX ст.) / У. А. Жылко // Язык. Общество. Проблемы межкультурных коммуникаций : матер. междунар. науч. конф., Гродно 20–21 марта 2012 г. – Гродно : ГрГУ, 2012. – С. 64–69.

13. Жылко, У. А. Выяўленне адметнасцей субкультуры дробнай шляхты ў творчасці Я. Баршчэўскага / У. А. Жылко // Содружество наук. Барановичи – 2012 : матер. VIII междунар. науч. конф., Барановичи 23–24 мая 2012. – Барановичи : БарГУ, 2012. – С. 193–196.

14. Жылко, У. А. Мастацкае ўвасабленне хрысціянскіх каштоўнасцей у рамантычнай творчасці Яна Баршчэўскага / У. А. Жылко // Коммуникативные стратегии искусства : матер. Респуб. научн.-практ. конф., Брест, 13–14 апр. 2012 г. – Брест : БрГУ, 2012. – С. 113–118.

15. Жылко, У. А. Ідэал мінуўшчыны як аб'ект духоўнай культуры беларуска-польскага рамантызму (XIX ст.) // Сучасны культурны працэс: праблемы, перспектывы, метады даследавання : XXXVII навук. канф., Мінск 18–19 красав. 2012 г. – Мінск : БДУКМ, 2012. – С. 65–70.

16. Жылко, У. А. Адметнасці субкультуры дробнай шляхты як часткі беларускай этнічнай супольнасці (на прыкладзе творчасці Я. Баршчэўскага / У. А. Жылко // Европа: актуальные проблемы этнокультуры : матер. междунар. научн.-теор. конф., Минск 22 мая 2012 г. – Минск : БГПУ, 2012. – С. 130–132.

17. Жылко, У. А. Рэалістычная парадыгма сацыякультурнага развіцця беларускага грамадства другой паловы XIX – пач. XX ст. / У. А. Жылко // Белорусская национальная культура и личность : сб. матер. XXXVIII итоговой науч. конф. студентов, магистрантов, аспирантов, Минск, 19 апр. 2013 г. – Минск : БГУКИ, 2013. – С. 307–313.

18. Жылко, У. А. Рэалістычнае адлюстраванне рэчаіснасці ў рамане І. Кандрацьева "Салтычыха" / У. А. Жылко // Талент, непадуладны часу : II Кандрацьеўскія чытанні, Вілейка 25 мая 2013 г. – Мінск : БДУКМ, 2013. – С. 36–44.

19. Жылко, У. А. Хрысціянскія каштоўнасці як маральна-рэгулятыўная аснова беларускага менталітэту / У. А. Жылко // Менталитет славян и интеграционные процессы: история, современность, перспективы : матер. VIII Междунар. науч. конф., Гомель, 23 – 24 мая 2013 г. – Гомель : ГГТУ им. П. О. Сухого, 2013. – С. 94–96.

20. Жылко, У. А. Маральна-рэгулятыўная роля хрысціянскіх каштоўнасцей у беларускім рамантызме (XIX ст.) / У. А. Жылко // Христианство и общество (к 1700-летию Миланского эдикта) : сб. матер. междунар. науч. конф., Барановичи, 17 мая 2013 г. – Барановичи : РИО БарГУ, 2013. – С. 127–130.

21. Жылко, У. А. Идеал как определяющий объект духовной культуры / У. А. Жылко // Консолидация научных исследований : сб. док. междунар. конф., Донецк 14 сент. 2013 г., Диверсификация научных подходов как основание повышения качества исследований : сб.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

док. междунар. конф., Донецк 12 окт. 2013 г. – Донецк : Науч.-информац. центр «Знание», 2013. – С. 140–143.

22. Жылко, У. А. Каштоўнасць як вызначальны аб’ект духоўнай культуры / У. А. Жылко // Философия и ценности современной культуры : сб. матер. междунар. науч. конф., Минск 10–11 окт. 2013 г. – Минск : БГУ, 2014. – С. 283–286.

23. Жылко, У. А. Роль субъекта культуры в рамках социокультурной парадигмы белорусского романтизма XIX в. / У. А. Жылко // Наука та сучасність: виклики XXI століття : зб. навук. прац міжнар. канф., Київ 31 січня 2014 року. – Київ : Центр науков. публікацій, 2014. – С. 147–151.

24. Жылко, У. А. Тэатр Тышкевічаў у Свіслачы як культурны асяродак канца XVIII – пачатку XIX ст. / У. А. Жылко // Рэпрэзентацыя і музеефікацыя творчай спадчыны Тышкевічаў у Беларусі і Літве : V міжнар. Тышкевіцкія чытанні, Мінск, Крэцінга, 14–15 мая 2014 г. : манаграф. зб. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, Kretingos muzejus grafu Tiskevicudvare. – Мінск, 2014. – С. 162–168.

25. Жилко, У. А. Интерпретация этнонациональных архетипов в белорусской художественной культуре XIX в. / У. А. Жилко // Зб. матер. Міжнар. наук.-практ. конф. «I Весняні наукові читання», Київ, 30 трав. 2015 р. – Київ : Центр наукових публікацій «Велес», 2015. – Т. 2 – С. 106–110.

**Тэзісы дакладаў**

26. Жылко, У. А. Этнакультурная дамінанта творчасці Яна Баршчэўскага / У. А. Жылко // НИРС – 2011 : сб. тез. док-ов. Респ. науч. конф. студентов и аспирантов Республики Беларусь. – Минск : Издат. центр БГУ, 2011. – С. 616.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# РЭЗЮМЭ

**Жылко Ульяна Аляксандраўна**

**Поліпарадыгмальнасць як адметнасць сацыядынамікі беларускай духоўнай культуры XIX ст.**

**Ключавыя словы:** сацыякультурная парадыгма, поліпарадыгмальнасць, аксіялагічны змест, грамадскія ідэалы, этнанацыянальныя архетыпы, сімвалы, “праграма жыццяўстойлівасці” этнічнай супольнасці, “праграма актыўнага дзеяння”, суб’екты культуры XIX ст.

**Мэта даследавання:** выяўленне спецыфікі поліпарадыгмальнасці як адметнасці сацыядынамікі беларускай духоўнай культуры XIX ст. (на матэрыяле твораў літаратуры і жывапісу).

**Метады даследавання:** аксіялагічны, семіятычны, герменеўтычны, сістэмны, гістарычны, кампаратыўны.

**Вынікі даследавання і іх навуковая навізна.** Упершыню праведзена комплекснае даследаванне гісторыка-культурнага перыяда XIX ст. у адпаведнасці з выяўленнем і апісаннем парадыгмаў сацыякультурнага развіцця грамадства, што дазволіла пашырыць і ўдасканаліць аналіз гісторыка-культурнай эпохі з пункту гледжання культуралогіі. У межах поліпарадыгмальнай духоўнай культуры акрэслены аксіялагічны комплекс, выяўлены сутнасныя адметнасці інтэрпрэтацыі каштоўнасцей, ідэалаў і архетыпаў як вызначальных аб’ектаў духоўнай культуры ў мастацкай творчай спадчыне XIX ст.; ахарактарызавана “праграма жыццяўстойлівасці” і “праграма актыўнага дзеяння”, актуальныя для этнічнай супольнасці ў эпоху паўставання нацыянальнай культуры.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні**. Матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны пры напісанні культуралагічных прац па гісторыі беларускай культуры XIX ст., а таксама могуць стаць тэарэтычнай часткай навуковага даследавання, прысвечанага аналізу гісторыка-культурнай эпохі, а таксама даследаванню літаратурных тэкстаў і твораў жывапісу з пункту гледжання культуралогіі. Атрыманыя вынікі могуць быць выкарыстаны ў рамках лекцыйных курсаў “Тэорыя і гісторыя культуры”, “Гісторыя беларускай культуралагічнай думкі”, “Архетыпы культуры”, “Аксіялогія культуры”, “Беларуская літаратура”, “Гісторыя беларускай культуры”, “Мастацкая культура Беларусі”.

**Галіна выкарыстання:** культуралогія, тэорыя і гісторыя культуры, аксіялогія культуры, семіётыка культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РЕЗЮМЕ

**Жилко Ульяна Александровна**
**Полипарадигмальность как особенность социодинамики белорусской духовной культуры XIX в.**

**Ключевые слова:** социокультурная парадигма, полипарадигмальность, аксиологическое содержание, общественные идеалы, этнонациональные архетипы, символы, “программа жизнеустойчивости” этнической общности, “программа активного действия”, субъекты культуры XIX в.

**Цель исследования:** выявление специфики полипарадигмальности как особенности социодинамики белорусской духовной культуры XIX в. (на материале произведений литературы и живописи).

**Методы исследования:** аксиологический, семиотический, герменевтический, системный, исторический, компаративный.

**Результаты исследования и их научная новизна.** Впервые проведено комплексное исследование историко-культурного периода XIX в. в соответствии с выявлением и описанием парадигм социокультурного развития общества, что позволило расширить и усовершенствовать анализ историко-культурной эпохи с точки зрения культурологии. В рамках полипарадигмальной духовной культуры XIX в. выявлен аксиологический комплекс, раскрыты сущностные особенности интерпретации ценностей, идеалов и архетипов как определяющих объектов духовной культуры в художественном наследии XIX в.; на основе выявленных объектов духовной культуры охарактеризована "программа жизнеустойчивости" и "программа активного действия", актуальные для этнической общности в эпоху формирования национальной культуры.

**Рекомендации по использованию**. Материалы исследования могут быть использованы при написании культурологических работ по истории белорусской культуры XIX в., а также могут стать теоретической основой научного исследования, посвящённого анализу историко-культурной эпохи, исследованию литературных текстов и произведений живописи с точки зрения культурологии. Содержащийся в диссертации материал может быть использован в рамках лекционных курсов “Теория и история культуры”, “История культурологической мысли Беларуси”, “Архетипы культуры”, “Аксиология культуры”, “Белорусская литература”, “История белорусской культуры”, “Художественная культура Беларуси”.

**Область применения:** культурология, история и теория культуры, аксиология культуры, семиотика культуры.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**SUMMARY**

**Zhylko Ulyana Alyaksandrauna**
**The Multiparadicmatic Character as a Feature of the Sociodinamics of Belarusian Spiritual Culture of the XIX Century**

**Keywords:** socio-cultural paradigm, polyparadigmality, axiological system, social ideals, ethnic and national archetypes, symbols, sustainability program of ethnic community, active action program, subjects of the XIX century culture.

**Reseach purpose:** to detect the multiparadicmatic character as a feature of the sociodinamics of Belarusian spiritual culture of the XIX century (in the creative heritage of the subjects of art).

**Research methods:** axiological, semiotic, hermeneutical, systematic, historical, comparative.

**Obtained results and their scientific novelty.** For the first time a comprehensive theoretical study of the historical and cultural period of the XIX century has been carried out in Belarusian cultural studies in accordance with the detection and description of the socio-cultural paradigms of the development of the Belarusian society, which will expand and improve the analysis of historical and cultural era from the perspective of cultural studies.

In the context of polyparadigmatic spiritual culture of the XIX century has been detected axiological system, identified the essential features of interpretation of values, ideals and archetypes as key objects of spiritual culture in the creative heritage of the individual subjects of the Belarusian culture of the XIX century.

On the basis of the detected objects of spiritual culture has been characterized sustainability program of ethnic community as well as active action program, which are topical for the ethnic community in the epoch of the formation of the Belarusian national culture XIX century.

**Use recommendations.** The research materials can be used for further process of writing cultural works about history of Belarusian culture of the XIX century, and can also become the theoretical basis for researches dedicated to the analysis of historical and cultural epoch, as well as literary texts and works of art from the perspective of cultural studies. The materials contained in the thesis can be used in the educational process of lecturing the following courses: “Theory and History of Culture”, “History of the belorussian culturological the thought”, “Axiology of Culture”, “Belarusian Literature”, “History of Belarusian Culture,” “Art Culture of Belarus.”

**Field of application:** Cultural Studies, History and Theory of Culture, Axiology of Culture, Semiotics of Culture.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковае выданне

**Жылко Ульяна Аляксандраўна**

**Поліпарадыгмальнасць як адметнасць сацыядынамікі беларускай духоўнай культуры XIX ст.**

**Аўтарэферат**
дысертацыі на атырманне вучонай ступені кандыдата культуралогіі па спецыяльнасці
24.00.01 – тэорыя і гісторыя культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падпісана ў друк 10.12.2015 г. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$
Папера офісная. Надрукавана на рызографе.
Ум. друк. арк. 1,5. Ул. выд. арк. 1,7.
Наклад 60 экз. Заказ № 103.

УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў".
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск